использовать их в качестве источника пространственной информации при решении задач территориального планирования, землеустройства, точного земледелия, геоэкологических, лимнологических и других научных и прикладных задач.

Важное значение в проведении научных исследований в рамках научных школ имеет понимание взаимосвязей природных и общественных процессов и явлений, умение их предсказывать. В рамках всех научных школ всесторонне оцениваются природные, социальные и хозяйственные комплексы, разрабатываются географические прогнозы того состояния, в каком ландшафт, озерная экосистема, природно-хозяйственная геосистема может оказаться под влиянием различных причин через 10, 20, 50 лет.

Географические науки всегда имели практическое назначение. В прошлом они снабжали общество преимущественно справочной информацией. Теперь практическая роль географии определяется ее участием в решении проблем взаимодействия природы и общества. Обострение этих проблем лишний раз доказывает, что географические исследования должны иметь предваряющий характер. Предшествование географических исследований разработке и утверждению любых проектов особенно важно в настоящее время.

**Бурачонак Аляксандр Вячаслававіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ДАСЛЕДАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў МЕЖАХ РАЗВІЦЦЯ НАВУКОВАЙ ШКОЛЫ «САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.»

На сучасным этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі ўсё большае значэнне набывае вывучэнне сацыяльнага складніка працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў мінулым. Важнасць гэтага ў свой час падкрэсліваў Джордж Макалей Трэвельян – адзін з вядомых англійскіх гісторыкаў канца XIX – першай паловы XX ст. У сваёй фундаментальнай працы «English social history» («Сацыяльная гісторыя Англіі») ён трапна адзначыў, што без сацыяльнай гісторыі эканамічная з'яўляецца пустой (бясплоднай), а палітычная – незразумелай [1, p. VII–VIII]. Варта трактаваць словы Д. М. Трэвельяна хутчэй не як навуковае азначэнне «сацыяльнай гісторыі», а як тэндэнцыю ў вывучэнні гістарычных працэсаў у міжваенны перыяд. Справа ў тым, што акадэмічная навука таго часу напаўнялася даследаваннямі, якія былі прысвечаны эканамічнаму развіццю краін, станаўленню гарадоў, палітычным інтарэсам, іх узаемадзеянню з эканомікай і г.д. Навукоўцы засяроджвалі сваю ўвагу пераважна на тых сілах, якія вызначалі гістарычнае развіццё, пры гэтым з поля зроку гісторыкаў паступова знікаў уласна чалавек. І калі ў заходнееўрапейскай гістарыяграфіі з сярэдзіны XX ст. прадметная вобласць гістарычнай навукі стала змяшчацца з «цэнтра» (улады) да яе «межаў» (жыцця простых людзей), а сама сацыяльная гісторыя набыла асноўныя рысы трансдысцыплінарнай

вобласці ведаў, то ў савецкай гістарыяграфіі таго ж часу падыходы да вывучэння шматлікіх працэсаў заставаліся ранейшымі.

Толькі ў выніку змены метадалагічнай парадыгмы айчынных навуковых даследаванняў на мяжы XX – XXI стст. гісторыкі ўсё больш сталі звяртацца да ролі чалавека ў гісторыі. Вынікам гэтага стала не толькі з’яўленне шэрагу навуковых прац па дадзенай праблематыцы, але і складванне на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўласнай навуковай школы «Сацыяльная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст.», кіраўніком якой з’яўляецца доктар гістарычных навук прафесар А.Г. Каханоўскі. У межах дзейнасці гэтай школы праводзяцца даследаванні, якія закранаюць праблемы сацыяльнай трансфармацыі беларускага грамадства ў парэформенны перыяд [2], міжсаслоўнай мабільнасці [3], сацыяльнай палітыкі расійскага ўрада ў дачыненні жыхароў беларускіх губерняў [4], эвалюцыі сацыяльна-прававога становішча такіх саслоўных катэгорый насельніцтва Беларусі, як шляхта [5], купецтва [6], мяшчанства [7], ганаровае грамадзянства [8, 9], сялянства [10], духавенства [11], а таксама пэўных прафесійных груп грамадства – земскіх начальнікаў [12], інтэлігенцыі [13], злачынцаў [14], жабракоў [15] і інш. У межах навуковай школы «Сацыяльная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст.» праводзіцца вывучэнне і працэсу развіцця рынку і рыначных адносін на тэрыторыі Беларусі ў парэформенны перыяд [16], у якім адна з ключавых роляў адведзена прадпрымальнікам.

У нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі тэма прадпрымальнікаў і прадпрымальніцтва як прадмета самастойнага даследавання з’яўляецца ў пэўнай ступені маладой, паколькі ў савецкія часы не мела належнага адлюстравання. Прычынай гэтага стала панаванне ўстойлівага меркавання адносна таго, што носьбіты прыватнай гаспадарчай ініцыятывы ў дарэвалюцыйнай Беларусі эксплуатавалі працоўнае і сялянскае насельніцтва, у сувязі з чым былі прылічаны да «варожых элементаў» і разглядаліся як кантэкст развіцця рэвалюцыйнага руху. І толькі з сярэдзіны 1990-х гг., калі ў рэспубліцы адбываўся працэс станаўлення дзяржаўнай ідэалогіі і пераход да цывілізаванай рыначнай эканомікі, стала нарастаць цікавасць да вопыту і традыцый прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі. Не толькі гісторыкі, але і эканамісты, правазнаўцы ўсё часцей у межах сваіх даследаванняў імкнуліся атрымаць адказ на пытанне адносна традыцый беларускага бізнесу. Вынікам гэтага стала з’яўленне на мяжы XX – XXI стст. шэрагу прац, якія прысвечаны пэўным аспектам прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, асабліва ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Сярод іх варта ўзгадаць дысертацыйныя даследаванні, якія прысвечаны дзейнасці купецтва ў названы перыяд [17, 18], развіццю гандлю ў канцы XVIII – XIX ст. [19, 20], фарміраванню крэдытна-банкаўскай сістэмы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [21] і інш. Акрамя пазначаных дысертацый, за дзесяцігоддзі існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь былі падрыхтаваны шматлікія раздзелы манаграфічных і калектыўных прац, артыкулы ў навуковых выданнях і перыядычным друку, тэлевізійныя і інтэрнэт праекты [22, с. 186], у якіх ў той ці іншай ступені адлюстравана

дзелавая актыўнасць насельніцтва беларускіх губерняў Расійскай імперыі.

Аднак у пераважнай большасці гэтых даследаванняў захоўваецца сталая тэндэнцыя адлюстравання ўласна эканамічных працэсаў, а не іх рухаючых сіл. Варта разумець, што за паказчыкамі даходаў, прыбыткаў, аб'ёму вытворчасці, тавараздвароту, крэдытных ставак у другой палове XIX – пачатку XX ст. стаялі канкрэтныя людзі, якія сваёй актыўнай гаспадарчай дзейнасцю стваралі тыя лічбы, якія сёння можна ўбачыць на старонках выданняў па эканамічнай гісторыі Беларусі адпаведнага перыяду. Усіх гэтых асоб аб'ядноўвала імкненне дасягнуць поспехаў у сваёй справе і атрымліваць сталы прыбытак са сваіх прадпрыемстваў. Але гэта былі людзі розныя па сваім саслоўным паходжанні, полу і ўзросту, этнічнай і канфесійнай прыналежнасці.

Пры правядзенні даследаванняў па праблеме прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі варта ўлічваць усе названыя сацыяльныя характарыстыкі. Так, напрыклад, эканамічна актыўныя суб'екты гаспадарання з ліку пэўных этнічных меншасцей на тэрыторыі Беларусі на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. былі абмежаваны ў правах землевалодання і землекарыстання, заснавання акцыянерна-паявых таварыстваў і удзелу ў іх [23, с. 132–135]. У залежнасці ад пэўнага гістарычнага перыяду паходжанне і падданства прадпрымальнікаў таксама з'яўляліся адной з важных умоў дасягнення імі поспехаў у сваёй справе [24, с. 68–70]. Саслоўнае паходжанне бізнесменаў на тэрыторыі Беларусі на працягу амаль усяго разглядаемага перыяду з'яўлялася крытэрыем для ўсталявання стаўкі па падатку і ў цэлым вызначала межы рэалізацыі прадпрымальніцкай ініцыятывы [25, с. 119–129]. Разам з тым, вызначэнне сацыяльнага складніку ў развіцці рынгачных адносін на тэрыторыі Беларусі дае не толькі дадатковы інструмент для правядзення даследавання, але і магчымасць вызначыць іх чалавечы твар. Так, напрыклад, вядома, што адзін з найбуйнейшых у дарэвалюцыйнай Беларусі і адзін з самых старэйшых з усіх дзеючых на сённяшні дзень беларускіх півоварных заводаў працуе ў Мінску. Разам з тым, адметнасць гэтага прадпрыемства ў парэформенны перыяд не выключна ў аб'ёмах яго вытворчасці, а хутчэй у сацыяльным складніку працэсу дасягнення поспехаў. У прыватнасці, у пачатку і ў канцы функцыянавання бровару справа знаходзілася ў жаночых руках. У розныя часы на чале завода знаходзіліся як расійскія, так і замежныя падданыя, розныя па сваім саслоўным паходжанні (мяшчане, купцы, дваранін) і канфесійнай прыналежнасці (іўдзеі, каталікі, пратэстанты) [26, с. 45–51]. І гэтыя сацыяльныя адметнасці вызначалі асаблівасці ў шляхах дасягнення поспехаў у канкрэтнай вытворчасці. Такіх прыкладаў у гісторыі прадпрымальніцтва ў дарэвалюцыйнай Беларусі вельмі багата. Таму зварот да сацыяльных складнікаў пры вывучэнні развіцця рынгачных адносін на тэрыторыі Беларусі мае вялікае значэнне і дапамагае больш аб'ектыўна і ўсебакова адлюстраваць гэты працэс. Адначасова з гэтым такі падыход дазваляе вярнуць, а зачастую і ўвесці ў навуковы зварот імёны тых бізнесменаў, якія давалі новае жыццё цэлым галінам народнай гаспадаркі і распаўсюджвалі, дзякуючы сваёй актыўнай эканамічнай дзейнасці, веды аб Беларусі далёка за яе межамі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Trevelyan, G. M. English social history: a survey of six centuries, Chaucer to Queen Victoria / G. M. Trevelyan. – London : Longmans, Green & Co., 1945. – XII, 628 p.

2. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.

3. Каханоўскі, А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. / А.Г. Каханоўскі // Российские и славянские исследования : науч. сб. – Минск, 2012. – Вып. 7. – С. 80–91.

4. Моторова, Н. С. Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914) : монография / Н. С. Моторова. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2019. – 350, [1] с.

5. Макарэвіч В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск : БДУ, 2018. – 315 с.

6. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльнае аблічча купецтва Беларусі на мяжы XIX–XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2004. – № 2. – С. 9–12.

7. Каханоўскі, А. Г. Эвалюцыя саслоўна-прававога становішча мяшчан Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Беларус. гіст. часоп. – 2016. – № 2. – С. 5–13.

8. Каханоўскі, А. Г. Ганаровыя грамадзяне ў саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Весн. Брэсц. ун-та. – Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2016. – № 1. – С. 15–20.

9. Щерба, Т. Н. Отношение почетных граждан к белорусскому национально-культурному движению в начале XX в. / Т. Н. Щерба // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістапада 2018 г. / рэдкал. : А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2018. – С. 284–286.

10. Маскевіч, Г. І. Палітыка ўрада Расійскай імперыі ў 60–90-я гг. XIX ст. як фактар фарміравання сацыяльнай стратыфікацыі сялянства Беларусі / Г. І. Маскевіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2006. – Вып. 7. – С. 97–107.

11. Карповіч, Н. В. Саслоўна-прававое становішча праваслаўнага духавенства Беларусі ў другой палове XIX ст. / Карповіч Н. В. // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст. : да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. : матэрыялы Рэсп. навук.-тэар. канф., Мінск, 23 лют. 2007 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. І. Андарала [і інш.]. – Мінск, 2007. – С. 139–143.

12. Страленя, А. А. Социальный состав земских начальников в Минской, Витебской и Могилёвской губерний в начале XX в. / А. А. Страленя // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2015. – Вып. 10. – С. 88–96.

13. Кохановский, А .Г. Белорусская интеллигенция: самоопределение и этапы становления в XIX – начале XX в. / А. Г. Кохановский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2007. – Вып. 2. – С. 3–20.

14. Бригадин, Д. П. Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / Д. П. Бригадин. – Минск : Государственный институт управления и социальных технологий БГУ, 2018. – 164 с.

15. Кныш, В. В. Колькасны і сацыяльны склад жабракоў Беларусі (60–90-я гг. XIX ст.) / В. В. Кныш // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2006. – № 4 (42). – С.18-25.

16. Бурачонак А. В. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Бурачонак. – Мінск, 2013.

17. Семенова, С. А. Купечество Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в.: дисс. … канд. ист. Наук : 07.00.02 / С. А. Семенова. – Минск, 2004.

18. Полетаева, Н. И. Купечество Беларуси (60-е годы XIX – начало XX века): дисс. … докт. ист. наук : 07.00.02 / Н. И. Полетаева. – Минск, 2005.

19. Шаўчэня, М. М. Развіццё гандлю ў Беларусі (канец XVIII – першая трэць XIX ст.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / М. М. Шаўчэня. – Гродна, 2003.

20. Карпіевіч, В. А. Развіццё гандлю ў Беларусі (1861–1900) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02: / В. А. Карпіевіч. – Мінск, 2003.
21. Дроздова, Е. А. Банковская система и ее роль в социально-экономическом развитии Беларуси (1861–1914 гг.): дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Е. А. Дроздова. – Минск, 2010.
22. Бурачонак, А. В. Дзелавая актыўнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. як актуальная праблема айчыннай гістарыяграфіі / А. В. Бурачонак // История и историография: объективная реальность и научная интерпретация : сб. науч. ст. по материалам междунар. науч. конф., посвящ. 140-летию со дня рождения акад. В.И. Пичеты / рэдкол.: А. Д. Король (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 184–188.
23. Бурачонак, А.В. Фарміраванне арганізацыйна-прававых асноў прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / А.В. Бурачонак // Беларускі археаграфічны штогоднік. / Рэдкалегія: Э.М. Савіцкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелНДІДАС, 2014. – Вып. 15.– С. 130–142.
24. Бурачонак, А.В. Палітыка ў адносінах да іншаземных прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. / А.В. Бурачонак // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістапада 2018 г. / рэдкал. : А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2018. – С. 68–71.
25. Бурачонак, А.В. Эвалюцыя заканадаўства ў сферы падаткаабкладання гандлю на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / А.В. Бурачонак // Беларускі археаграфічны штогоднік. / Рэдкалегія: Э.М. Савіцкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелНДІДАС, 2016. – Вып. 17. – С. 118–133.
26. Бурачонак, А.В. Бровар з адметнай гісторыяй: заснаванне і дзейнасць мінскага піваварнага завода Фрумкіных–Чапскага–Лекертаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. / А.В. Бурачонак // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. – 2018. – № 4. – С. 44–53.

**Верле Артем Викторович**
*Псковский государственный университет (Псков, Россия)*

## МЫШЛЕНИЕ КАК ПИТАНИЕ (ПО ПОВОДУ ОДНОЙ ФРАЗЫ ИЗ «СПОРА ФАКУЛЬТЕТОВ» И. КАНТА)

Фразу, о которой я веду речь, можно найти в третьем разделе «Спора факультетов» (1798) Иммануила Канта. Называется этот раздел «Спор философского факультета с медицинским» и посвящен он, в целом, идее координации и соответствия здоровья духа и здоровья тела. Звучит фраза так: «Einem Gelehrten ist das *Denken* ein Nahrungsmittel, ohne welches, wenn er *wach und allein ist,* er nicht leben kann; jenes mag nun im *Lernen* (Bücherlesen) oder im *Ausdenken* (Nachsinnen und Erfinden) bestehen» («Для ученого *мышление* составляет питание, без которого он, пребывая *в одиночестве и бодрствуя*, не может жить; мышление может заключаться в *приобретении знаний* (чтении книг) или в самостоятельном *исследовании* (обдумывании и открытиях)») [5, 252-253, курсив автора. – А.В.]. Интересно рассмотреть основания и следствия этой идеи, во-первых, в контексте кантовской мысли, а во-вторых, в перспективе современного состояния и устремлений университетского образования.

«Спор факультетов» – сочинение крайне своеобразное. Оно является, в значительной степени, выводом из личного опыта и годами выверенного отношения Канта к миру. В 1796 г. Кант заканчивает преподавательскую деятельность, которой посвятил 40 лет своей жизни, пройдя все ступени академической карьеры от приват-доцента до ректора. В этом году философу исполнилось 72 года, отмеченные последовательной и строгой организацией жизни, стоическим отношением к быту и дей-